**Інфармацыя для грамадзян Украіны і Рэспублікі Беларусь адносна падачы заяў на атрыманне нацыянальных віз**

Заявы на атрыманне нацыянальных віз можна будзе падаць пасля папярэдняга запісу на падачу заявы на сайце https://visa.vfsglobal.com/pol/pl/pol/ Рэгістрацыя на падачу заявы будзе даступная 22.09.2022 Заяву на атрыманне візы неабходна падаць у Пункце прыёму візавых заяў, у адпаведнасці з выбранай раней рэгістрацыяй, размешчаным у:

- Варшаве, вул. Алее Еразалімске 181Б (першы паверх, уваход Б-1), з 8.30 да 16.30
- Познані, вул. Францішка Ратайчака 19 (першы паверх), з 8.30 да 16.30
- Любліне, вул. Томаша Зана 39А (чацвёрты паверх), з 8.30 да 16.30

У сувязі з вялікай цікавасцю да магчымасці падачы візавых заяў час чакання рэгістрацыі можа быць павялічаны. Супрацоўнікі пунктаў прыёму візавых заяў і інфалініі прыкладуць усе намаганні, каб абслугоўванне асоб, якія хадайнічаюць аб атрыманні візы было эфектыўным і кампетэнтным. Асобам, якія не змогуць зарэгістравацца на падачу візавых заяў неабходна ўвесь час сачыць на нашым сайце за навінамі і інфармацыяй пра з’яўленне новых тэрмінаў рэгістрацыі заяў, якія будуць дадавацца паступова.

Нагадваем, што ў адпаведнасці з Распараджэннем Міністра замежных спраў Польшчы ад 18 жніўня 2022 года «Аб выдачы нацыянальных віз іншаземцам, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча», падаваць заявы на атрыманне нацыянальных віз будуць мець права грамадзяне:

- грамадзяне Украіны і грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія хадайнічаюць аб атрыманні візы з мэтай выканання працы ў якасці кіроўцы ў міжнародных аўтамабільных перавозках або некамерцыйных міжнародных аўтамабільных перавозках,
- грамадзяне Украіны, якія хадайнічаюць аб атрыманні візы з мэтай выканання працы ў якасці пілота або іншага члена экіпажа грамадзянскага паветранага судна,
- грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія хадайнічаюць аб атрыманні віз, пра якія ідзе гаворка ў абзацы першым пункта 23 артыкула 60 Закону «Аб іншаземцах» ад 12 снежня 2013 года (віза выдаецца для ўезду ў гуманітарных мэтах, у сувязі з інтарэсамі дзяржавы або міжнароднымі абавязацельствамі), якія з прычынаў бяспекі, з-за магчымых рэпрэсій або пераследу не могуць вярнуцца ў краіну паходжання, і якія ў дзень падачы заявы на атрыманне нацыянальнай візы легальна знаходзяцца на тэрыторыі Польшчы на падставе дзейных віз, выдадзеных раней з той жа мэтай (з гуманітарнымі мэтамі, у сувязі з інтарэсамі дзяржавы або міжнароднымі абавязацельствамі) або якія заявяць, што да 24 лютага 2022 года легальна знаходзіліся на тэрыторыі Украіны і прыехалі ў Польшчу з тэрыторыі Украіны з 24 лютага 2022 года ў сувязі з ваеннымі дзеяннямі, якія вядуцца на яе тэрыторыі.